МАСТАЦТВА. 2013.№ 10.с.44-47.
РАБОТА З НАТУРЫ”

Многія гісторыкі і краязнаўцы называюць Бярэзінскі раён Мінскай вобласці - Бярэзіншчыну “радзімай талентаў”. Менавіта тут пачыналі свой жыццёвы шлях вучоныя з з сусветным імем - фізік,былы прэзідэнт Акадэміі навук БССР Мікалай Барысевіч, хімік Рыгор Старобінец, аграхімік Роберт Вільдфлуш, біёлаг Яўген Сідаровіч, беларускі кампазітар, аўтар музыкі на тэксты царкоўных малітваў, у тым ліку “Магутны Божа” (на словы Н.Арсеньевай) Мікола Равенскі, вядомы мастак Валенцій Ваньковіч, беларускія жывапісцы Дзмітрый Алейнікі і Мікалай Казакевіч, мастак кіно Марыя Бярковіч, беларускія пісьменнікі Янка Туміловіч, Рыгор Няхай, Яўген Курто, Якаў Герцовіч, Іван Маркевіч, Міхась Скрыпка, Якуб Ермаловіч, Іван Бабіновіч, польскія пісьменнікі Мельхіёр Ваньковіч і Юзаф Масальскі, літаратуразнаўцы Павел Дзюбайла. Міхась Няхай, Мікола Прашковіч, народны артыст Беларусі Валянцін Белахвосцік, заслужаны артыст Беларусі Барыс Барысёнак, вядомыя беларускія філосафы Сяргей Лапцёнак і Святлана Вінакурава, вялікая ізраільская драматычная актрыса Хана Ровіна. Прэмія за акцёрскае майстэрства яе імя - адна з самых прэстыжных у Ізраілі.

Пачэснае месца сярод нашых славутых землякоў займае таленавіты пейзажыст і партрэціст Апалінарый Гіляравіч Гараўскі, якога многія прыхільнікі беларускага мастацтва называлі “мастаком ад бога”.

Яго “малая радзма” або “родны кут” - маёнтак Уборкі былога Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Бярэзінскі раён Мінскай вобласці). Тут ён і з’явіўся на свет 30 студзеня 1833 года.

Калі чытач даведаецца, што жыццё і дзейнасць Апалінарыя і яго братоў Іаліта і Гілярыя была звязана з Пецярбургскай акадэміяй мастацтваў, ён. напэўна скажа так: “Яны не з сялянскай сям’і “ . І не памыліцца, таму што ўсе браты нарадзіліся ў абяднеўшай дваранскай сям”і.

Калі Апалінарыю споўнілася дванаццаць гадоў, яго бацька – Гілярый Гароўскі прывёз сына на вучобу ў Брэст-Літоўскі кадэцкі корпус. На жаль, ні адзін мастацтвазнаўца нічога не піша аб гэтай навучальнай установе. Што яна ўяўляла сабой?

Вучоныя гісторыкі называюць гэту сярэднюю навучальную ўстанову закрытага тыпу для падрыхтоўкі дзяцей да вайсковай службы так: “Аляксандраўскі Брэсцкі калэцкі корпус, з 1857 Аляксандраўскі кадэцкі корпус”. На самой справе, ў 1840-я гады (да 1857 года), дакладней, у той час, калі ў ім вучыўся будучы беларускі пейзажыст і майстар партрэта А.Г.Гараўскі”, навучальная ўстанова называлася наступным чынам: “Брэст-Літоўскі кадэцкі корпус” і магчыма толькі ў канцы яго вучобы да яго наймення прыбавілася “Аляксандраўскі”.

Ён існаваў у 1842-1863 гадах. Дадзены кадэцкі корпус быў заснаваны ў Брэст-Літоўску на сродкі казны, а таксама памешчыкаў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці. Найменне “Аляксандраўскі” ёе атрымаў у гонар свайго шэфа, будучага імператара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аляксандра II, які ў 1849-1855 гадах быў галоўным начальнікам кадэцкіх карпусоў Расіі.

Корпус размяшчаўся ў пераабсталяваным будынку бернардзінскага кляштара на Валынскім умацаванні Брэст-Літоўскай крэпасці. У корпус прымалі дзяцей дваран, штаб- і обер-афіцэраў ва ўзросце 9,5- 11,5 года (Апалінарый быў у нейкай ступені перарасткам –Э.І.). Ён быў разлічаны на 400 навучэнцаў (кадэтаў). Выкладаліся агульнаадукацыйныя прадметы за курс гімназіі (мовы, прыродазнаўчыя і грамадазнаўчыя навукі). стралковая падрыхтоўка, верхавая язда, ружэйная тральба, фехтаванне, гімнастыка,. плаванне, музыка і танцы. Выпускнікі накіроўваліся пераважна ў юнкерскія вучылішчы для працягвання ваеннай адукацыі, у надзвычайных выпадках (вайна) пасля сканчэння спецыяльнага класа – адразу ў гвардыю або армію афіцэрамі.

Якую ролю ў лёсе Апалінарыя Гараўскага адыграў Брэст-Літоўскі кадэцкі корпус?

Менавіта тут мастацкі талент будучага жывапісца заўважыў вядомы архітэктар Н.Бенуа, які часта бываў у свайго брата – начальніка корпуса палкоўніка Бенуа. Значна пазней А.Гараўскі з падзякай успамінаў аб гэтым чалавеку, які заклаў у ім першапачатковыя асновы мастацкай граматы і падрыхтаваў яго да паступлення ў 1850 годзе ў Пецярбургскукю акадэмію мастацтваў.

Вялікую ролю ў лёсе Гараўскага адыграў таксама сам палкоўнік Бенуа. У адным з пісем Апалінарыя Гіляравіча у 1857 годзе да заснавальніка Траццякоўскай галерэі П.М.Траццякова былі такія радкі:

“Любя и понимая живопись, он заметил во мне способность, старался настроить к большому изучению в искусстве и привёз меня в Петербург, через его старания попал и в Академию пенсионером” [1].

А цяпер спынімся на 1850-1854 гадах - часе вучобы Гараўскага ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Менавіта тут ён займаўся пад кіраўніцтвам вопытных прафесараў М.Вараб’ёва і Ф.Бруні. Ужо з першых дзён вучобы юнак праявіў выдатныя здольнасці да пейзажнага і партрэтнага жывапісу. Так, у 1852 годзе яго пейзаж “Балота”, напісаны ў час летніх вакацый у Мінскай губерні, быў удастоены пахвалы акадэмічнага савета і набыты з акадэмічнай выставы наследнікам імператара [2].

З 1852 года 19-гадовы Апалінарый становіцца удзельнікам выстаў (Акадэміі мастацтваў, усерасійскай, Таварыства рускіх акварэлістаў, Таварыства выстаў мастацкіх твораў за мяжой і іншых).

У 1853 годзе 20-гадовы А.Гараўскі паспяхова экспанаваў на акадэмічнай выставе партрэт епіскапа Вайткевіча, таксама напісаны ў час прабывання ў Беларусі. Гэты партрэт адразу прыцягнуў увагу да творчасці маладога мастака. Мастацкі крытык А.Майкоў у аглядзе выставы, змешчаным у часопісе “Айчынныя запіскі”, адзначыў гэты партрэт у ліку лепшых карцін, назваўшы яго “выдатным” [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Менавіта ў тым самым 1853 годзе 22-х гадовы Апалінарый Гараўскі ўжо атрымаў такую колькасць залатых і срэбраных медалёў, якія давалі яму права канкурыраваць на вялікі залаты медаль. У якасці праграмы мастаку зацвердзілі пейзаж "Від у Пскоўскай губерні". Месца для напісання дыпломнага пейзажа Гараўскі выбраў не выпадкова. У гэты час сюды, у Пскоўскую губерню перасяліўся палкоўнік Бенуа, у якога часта бываў Апалінарый [4].

Справядлівасць перамагла. За пейзаж "Від у Пскоўскай губерні" А.Гараўскаму былый прысуджаны залаты медаль першага дастоінства і званне класнага мастака, што давала яму права на замежную паездку.

Аднак Апалінарый Гіляравіч не адразу паехаў за мяжу. Да мая 1858 года ён знаходзіўся ў сябе на радзіме, у вёсцы Уборкі тагачаснага Ігуменскага павета. У гэты час ён з вялікай энергіяй аддаецца любімай справе, піша шматлікія эцюды беларускай прыроды, кампануе з іх станкавыя пейзажы. Лепшымі работамі гэтага перыяду з'яўляюцца "Бераг ракі Свіслач", "Ліпы" (апошні пейзаж быў набыты вядомым калекцыянерам К.Т.Салдаценкавым – Э.І.) і шматлікія віды наваколляў крэпасці Бабруйск. Мастак уважліва вывучае прыроду, скрупулёзна перадае ўсе бачанае, не даруе сябе нават самага малога промаху.

Гараўскі па некалькі раз перамалёўвае ўжо намалёванае. У пісьме да П.М.Траццякова, датаваным 1854 годам, ён адзначае:

"Теперь я пишу "Липы" Козьме Тереньевичу (Солдатенкову –Э.І.), начиная от воздуха почти всё вновь. Потому что как увидел в натуре облака, так на моей картине точно как на конфетке расписано, то я с досады вновь стал писать и не буду рассчитывать ни времени, ни ничего, лишь бы т олько вышло хорошо" [5].

Упартая праца А.Г.Гараўскага прыносіла добрыя вынікі. Многія яго пейзажы атрымаліі высокую ацэнку мастацтвазнаўцаў і прыхільнікаў высокага мастацтва. Некаторыя набыў для сваёй галерэі П.М.Траццякоў.

Акрамя пейзажаў, у 1854-1858 гадах Апалінарый Гіляравіч напісаў шэраг партрэтаў. Але праца над заказнымі партрэтамі не прыносіла яму маральнага задавальнення, таму што залежнасць ад густа заказчыка пазбаўляла мастака магчымасці удасканальваць сваё майстэрства. Гараўскі ўсяляк імкнуўся пазбавіцца ад такіх заказаў, аднак цяжкае матэрыяльнае становішча сям'і і хвароба бацькі вымушалі яго ісці на творчы кампраміс. Так, ён піша партрэты мінскага архіерэя Галубовіча,. мітрапаліта Галавіна і іншых.

Мала каму вядома, што у А.Г.Гараўскага былі вялікія заслугі ў галіне збору і захоўвання культурных каштоўнасцей. Знаходзячыся на працягу многіх гадоў у вялікім сяброўстве з расійскім мастацкім дзеячам П.М.Траццяковым, ён разам з братам Іпалітам дапамагаў яму фарміраваць мастацкую калекцыю. Апалінарый Гіляравіч дапамагаў Паўлу Міхайлавічу ў пошуках і набыцці многіх твораў жывапісу. Так пры пасрэдніцтве А..Гараўскага Траццяковым былі набыты для галерэі славуты "Партрэт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скульптара-медальера Ф.Талстога” працы С.Заранкі, палотны В.Баравікоўскага, А.Саўрасава і іншых мастакоў. Расійскі збіраль нік, чыё імя носіць славутая галерэя ў Маскве высока ціаніў думку і густ А.Г.Гараўскага.

Адначасова мастак усё ж знаходзіць час, каб ствараць творы, якія праўдзіва адлюстроўваюць жыццё. Так з’яўляецца “Яўрэй пры малітве”. які атрымаў высокую ацэнку на выставе ў Пецярбургу”, і “Старая моліцца”.

Спынімся на гісторыі стварэння карціны “Старая моліцца”. Апалінарый Гіляравіч задумаў гэты твор у 1856 годзе. Першапачаткова работа над карцінай ішла вельмі марудна., таму што натуршчыца – пажылая беларуская сялянка часта хварэла і не магла падоўгу пазіраваць. Нарэшце 27 кастрычніка 1857 года мастак паведамляў П.М.Траццякову:

“Усердно, со слезами молящуюся старуху кончил и благодаря всевышнему вышла лучшим произведением из всех,. которые только писал. Надеюсь, что всякий из знатоков согласится с моим мнением: рельефность головы, рук,. рисунок, колорит и выполнение и скромность живописи в подражание натуры, насколько мне не страшно, если станут сравнивать с портретами Штейбека работы и Зарянко” [6].

Геніяльны расійскі мастак Ілля Яфімавіч Рэпін даволі высока ацаніў тэхнічнае выкананне твора Гараўскага “Старая моліцца”. Ён знайшоў карціну моцнай па тэхніцы і адзначыў, што твар старой “напісаны “ с порамі на коже” [7].

Змест карціны наводзіць гледача на глыбокія разважанні. Прымушае думаць пра лёс радзімы. Таму вобраз страрой беларускай сялянкі сімвалізуе прыгнечаную шматпакутную Беларусь, якая стагнала пад уціскам царызму.

Ацэнка Рэпіна, дадзеная рабоце “Ст арая моліцца”, не вычэрпвае мастацкі змест карціны.У сувязі з гэтым беларускі мастацтвазнаўца Л.Н.Дробаў падкрэсліваў:

“Чтобы сконцентрировать внимание на лице и руках портретируемой, художник показывает пожилую белорусскую женчщину крупным планом. Взор её обращён к небу. Губы шепчут слова молитвы. Руки, видевшие на своём веку всякую работу, сложены вместе. На лице – печать покорности и смирения. Бесправие и нищета наложили отпечаток на весь облик женщины. Тихая, робкая, забитая, со словами надежды она обращается к богу, в которого искренне верит. По силе типизации, по глубине социальной характеристики это одно из лучших произведений живописца. Оно во многом созвучно лучшим произведениям русской реалистической живописи второй половины XIX в.

Первый вариант картины был написан в 1857 г. Однако Горавский долго не решался отдавать её на суд общественности. Так как считал произведение незавершённым. И только в 1861 г., после возвращения из-за границы, вместе с другими работами (две картины и 90 этюдов), сделанными во время пенсионерства, академическому совету была представлена и «Молящаяся старушка». За эту и другие работы художник был удостоен

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

звания академика (Л.Н.Дробаў робіць спасылку на Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Ленінграда. Фонд 789 . Воп.14. Спр.26.Л.9- Э.І).

Картина пользовалась большим успехом на выставках в России и за рубежом. О ней писали в периодической печати. В 70-х годах (XIX стагоддзя – Э.І.) художник сделал повторение картины, которое экспонировалось на выставках в Париже и Брюсселе» [8].

Натхнёны высокімі ідэаламі служэння мастацтву, у маі 1858 года Апалінарый Гараўскі выехаў за мяжу (па другім дадзеным, яго першая паездка за мяжу адбылася ў 1855 годзе –Э.І.). На пенсію Пецярбургскай акадэміі мастацтваў ён удасканальваў майстэрства ў Жэневе, Дзюсельдорфе, Рыме і Парыжы. У Жэневе і Дзюсельдорфе Гараўскі наведаў майстэрні жывапісцаў Каляма і Ахенбаха. Але сустрэча з славутымі замежнымі жывапісцамі не прынесла яму маральнага задавальнення. Так. знаходзячыся ў Жэневе, Апалінарый Гіляравіч пісаў:

“У майстэрні Каляма і цяпер не займаюся і толькі зрэдку заходжу паслухаць яго парады і заўвагі. Астыў я да яго крыху за тое, што ён больш хваліць, чым папракае. Мне здаецца,. ён вялікі палітык. Урэшце, да гэтага мне няма справы. Калям Калямам, але прырода, па мойму, самы лепшы настаўнік” [9].

З гэтага і іншых пісьмаў А.Гараўскага бачна, што ён не быў схільным слепа пераймаць “рэцэпты поспеху” замежных мастакоў. Мастак моцна стаяў на пазіцыях расійскай рэалістычнай школы, у сутнасці якой была закладзена работа ў натуры як першаасноваў творчасці жывапісцаў.

У 1859 годзе Апалінарый Гіляравіч наведвае Рым, які лічыўся тады “сталіцай усіх мастакоў свету”. але і тут яго чакала рачараванне. І зноў. Як у Жэневе і Дзюсельдорфе, Гараўскі адчуў сябе адзінокім. Ён цалкам аддаецца маляванню з натуры.

Журба па радзіме і адзіноцтва прыгняталі мастака. Не дабыўшы устаноўленага тэрміну пенсіянерства, у 1860 годзе Гараўскі вярнушся на радзіму. З гэтага часу на працягу амаль 30 гадоў Апалінарый Гіляравіч жыве ў Мінскай губерні і толькі зрэдку выязджан з сям’ёй у Пскоўскую губерню да родзічаў жонкі.

Што датычыцца зім, Гараўскі праводзіць іх у Пецярбургу, дзе выкладае жывапіс у Вышэйшай мастацкай школе пры Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

Менавіта ў 1860 годзе 27-гадовы Апалінарый Гіляравіч, жывучы ў вёсцы Брадзец сучаснага Бярэзінскага раёна (у гэтай вёсцы жыла яго сястра – Э.І.) стварае цудоўны пейзаж “На радзіме”. Гэту карціну высока ацаніў П.М.Траццякоў і набыў яе для сваёй галерэі. Да сенняшняга дня яна знаходзіцца ў фондах Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. Можна дадаць, штро дадзеная карціна з’яўляецца лепшым творам жывапісца, у якім знайшлі адбітак думкі і пачуцці А.Гараўскага, яго роздум над над лёсам радзімы.

Вось як каменціруе змест карціны “На радзіме” беларускі мастацтвазнаўца Л.Н.Дробаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“На пярэднім плане намаляваны напаўразбураны драўляны маток, праз які віецца ўдалеч пясчаная дарога. Удалечы відаць саламяныя стрэхі сялянскіх хат. Паабапал дарогі плот з жэрдак, з пахіленымі ад старасці драўлянымі слупамі. У гэтым пейзажы ўсё блізкае і дарагое сэрцу мастака. Кожная дэталь напісана з вялікай цеплынёй і любоўю. Гэта любоў міжволі перадаецца і гледачу.

З вялікім выкрывальным пафасам паказвае мастак заняпад беларускай вёскі. І хоць у карціне людзі не паказаны, глядая добра адчувае іх прысутнасць Сілай свайго таленту мастак здолеў стварыць праўдзівую карціну жыцця сялян дарэвалюцыйнай Беларусі. У гэтай працы, бясспрэчна, адчуваюцца ўплывы асабістага сяброўства мастака з Пяровым, Багалюбавым і іншымі прадстаўнікамі крытычнага рэалізму 60-х гадоў (XIX стагоддзя – Э.І.). сімпатыя да іх (гэта відаць з яго пісьмаў да П.М.Траццякова –Э.І.)” [10].

Нягледзячы на поспехі, якія дасягнуў Апалінарый Гіляравіч у пейзажным і партрэтным жывапісе ш 1860-я гады, ён адчуваў матэрыяльную нястачу. Гараўскаму трэба было працаваць, каб набыць, як кажуць. кавалак хлеба.

Яшчэ ў 1860 годзе мастак падае рапарт у савет Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, у якім просіць прадоўжыць пенсіянерства на тры гады. Але просьба Гараўскага была адхілена. Тады Апалінарый Гіляравіч спрабуе дамагчыся ад акадэміі дазволу працягваць адукацыю ў межах Расійскай імперыі. Паміж ім і акадэміяй вялася доўгая перапіска. Нарэшце ў 1869 годзе савет акадэміі пастанавіў:

“Дазволіць акадэміку Гараўскаму падарожжа па Расіі для заканчэння сваёй адукацыі і напісання карцін з народнага быту тэрмінам на тры гады, выдзяліўшы яму на ўтрыманне па 300 рублёў у год” [11].

Апалінарый Гіляравіч зноў з натхненнем бярэцца за працу. Ён едзе на Украіну і ў найбольш глухія мясціны Беларусі. У выніку гэтай паездкі з’явілася серыя партрэтаў і пейзажаў, лепшыя з якіх былі напісаны ў ваколіцах ракі Бярэзіны.

У 1870 годзе мастак пачаў работ у над сваёй вядомай карцінай “Балота”. Для збора матэрыяла Гараўскі выязджаў у забалочаныя месцы Мінскай губерні, каб “зняць” эцюды з натуры. Але раптоўная хвароба – рэўматызм прыкавала яго да ложка. Знаходзячыся ў цяжкім стане, Апалінарый Гіляравіч пісаў у Пецярбургскую акадэмію мастацтваў са станцыі Свіслач Бабруйскага павета:

“Путешествуя с ранней весны, я занимался съёмкой эцюдов с натуры из русской природы и изучением коров. телят, овец и типичных фигур, чтобы соединить пейзажный род с фигурами и животными. И в июле месяце, писавши с натуры весьма характерные «Пинские болота», от сырой почвы, зелени и тамошнего воздуха незаметным образом получил лихорадку и ревматизм в правой ноге. Так что принужден был оставить начатую работу и, вылечившись, опять занялся новыми материалами, поэтому и отстал от задуманного мной дела, которое при здоровье постараюсь всеми силами

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вознаградить. И тогда буду иметь честь и удовольствие представить Вашему превосходительству и совету Академии художеств труды свои на благоусмотрение, а в настоящее время буду заниматься до тех пор, пока холод не прогонит меня» [12].

З пейзажаў, створаных у пачатку 1870-х гадоў. найбольш цікавы "Вечар у Мінскай губерні". Матыў, выбраны для гэтага пейзажа просты. На пярэднім плане – невялікі ручаёк. Яго перасякае дарога, якая ўходзіць удалеч. У аддаленні бачны абрысы населенага пункта. На другім плане – два магутных дуба. На дарозе – постаці людзей з сабакай, якія ідуць у горад. Жывапіс пейзажа,. як і ўсіх работ А.Гараўскага гэтага перыяду. сухавата, у ёй шмат "чарнаты". І толькі ў канцы жыцця мастака, прыкладна ў 1890-х гадах, "чарната" знікла з яго жывапісу. Аб гэтым сведчаць пейзажы, напісаныя ў 1897 годзе ў маёнтку Зачарэнне і іншых месцах Беларусі і Пскоўскай губерні. Што датычыцца работы, якая створана ў Зачарэнні,. то яна экспануецца сёння ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.. Каларыт у гэтай карціне светлы, пісьмо шырокае. Уся работа вельмі лірычная.

У 1870-х гадах паралельна з пейзажамі мастак стварае шмат партрэтаў. Гэта адносіцца пераважна да часу яго зімняга прабывання ў Пецярбургу. У тыя гады былі створаны партрэты рэктара Пецярбургскай акадэміі мастацтваў жывапісца Бруні , кампазітараў Глінкі і Даргамыжскага (партрэты напісаны па фатаграфіям., якія раней знаходзіліся ў Траццякоўскай галерэі), мітрапаліта Галавінскага, графа Шарамецьева і іншыя.

У 1885-1886 гадах адбыліся паездкі А.Г.Гараўскага па Сібіры.

У 1888 годзе на акадэмічнай выставе з'явіўся партрэт Апалінарыя Гіляравіча "Селянін", аб якім пецярбургская газета "Навіны" пісала:

"Академик Горавский выставил всего лишь одного "Крестьянина", но зато такогог интересного, что он мог бы показывать себя за деньги, именно "столетнего" [13].

Праз год - у 1889 годзе мастак сціпла паведамляў П.М.Траццякову:

"...У вёсцы напісаў партрэт стагадовага селяніна, які паказаў на выставе...Тыпаж і каларыт карціны атрымаліся нядрэнна".

У гэты час у творчасці Гараўскага назіраюцца істотныя змены. Ад сухога скрупулёзнага капіравання натуры мастак пераходзіць да больш шырокага, абагульненага пісьма, імкнецца перадаць не толькі падабенства адлюстроўваемага матыва, але і яго эмацыянальны настрой, які адпаведным чынам уплывае на каларыт і кампазіцыю карціны.

У адным з апошніх пісем П.М.Траццякову ён паведамляў:

"Написал 20 этюдов, бил преимущественно не на детальность, а на верность момента солнечного и колорита» [14].

Гэту асаблівасць творчасці жывапісца ў 1890-х гадах адзначала сучасная яму мастацкая крытыка. Так, ацэньваючы карціны А.Гараўскага "Восень і "Час жніва", якія былі выстаўлены на акадэмічнай выставе ў 1890 году "Пецярбургская газета" адзначала:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Есть много вещей,. на которые смотришь с удовольствием. Так. например, господина Горавского «Осень» - столько правды в красках, что даже неоконченность письма и плосковатость в рисунке не могут сгладить общего впечатления» [15].

Такім чынам, пачаўшы сваю творчасць як заўзяты паклоннік акадэмічнага жывапісу, А.Гараўскі ў канцы жыцця прыйшоў да рэалізму. Адной з прычын такой эвалюцыі безумоўна з’яўлялася яго блізасць да перадавых колаў рускіх мастакоў.

Калі ў цэлым характарызаваць творчасць Апалінарыя Гіляравіча, то трэба падкрэсліць, што пераважная большасць яго твораў адметныя жыццёвай праўдай, глыбокай народнасцю, высокім тэхнічным майстэрствам, паэтычна апаваюць прыгажосць беларускай прыроды і народны побыт.

Ацэньваючы творчую спадчыну гэтага мастака, нельга не згадзіцца з наступнымі словамі беларускага мастацтвазнаўцы Б.Лазукі:

“Творчасць А.Гараўскага мнагастайна. Але асноўную яе частку складаюць пейзажы, над якімі мастак працаваў усё жыццё. Жывапісная манера майстра была заснавана на акадэмічных прынцыпах, рэалістычнасці паказу матываў прыроды. Для яго важным з’яўлялася разлічанае, шмат у чым відавое прадстаўленне пейзажнай тэмы. Таму асаблівую ўвагу ён надаваў кампазіцыйнай пабудове выяў. Імкнучыся да ўраўнаважанасці, падзелу паказваемай прасторы на планы. Традыцыйна дзеля гэтага крыху зацямнялася пярэдняя частка палатна. Там не змяшчаліся важныя аб’екты. і рабіліся высвятленні ў цэнтры, дзе паказваліся фігуры людзей ці пэўныя прадметы, збудаванні. Такім чынам, стваралася пэўная эстэтычная дыстанцыя паміж гледачом і той часткай карціннай прасторы, дзе канцэнтраваўся асноўны эфект пейзажу” [16].

Апошнія гады жыцця Аплінарый Гіляравіч правёў у сваім невялікім маёнтку Кірылавічы, які размяшчаўся каля станцыі Белае былой Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Да канца сваіх дзён мастак губляў сувязі з роднай Беларуссю, цаніў яе багатую культуру, звычаі і мову. Ва многіх пісьмах да П.М.Траццякова і другіх асоб Гараўскі вельмі часта ўжываў беларускія словы і выразы. Гэта сведчыць аб тым, што ў побыце, у звычайным жыцці, сярод кола сваёй сям’і і сяброў, ён карыстаўся беларускай мовай.

Памёр Апалінарый Гіляравіч у 1900-м годзе ў вышэйназваным маёнтку Кірылавічы Пецярбургскай губерні. Вельмі шкада, што да сенняшняга дне невядомы. якога числа і ў якім месяцы гэта адбылося.

Творы А.Г.Гараўскага знаходзяцца ва многіх гарадах і вёсках на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, у тым ліку ў Расіі (асабліва ў Маскве і Саннкт-Пецярбургу), Беларусі і Літве.

Нашым сучаснікам пашчасціла, што ў 1944-1977 гадах - на працягу 33 гадоў дырэктарам Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі працавала апантаны збіральнік карцін беларускіх мастакоў і расійскіх мастакоў з “беларускай тэматыкай” Алена Васілеўна Аладава. Менавіта дзякуючы яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пошукам, энергіі і намаганням быў значна адноўлены і папоўнены фонд музея. Менавіта ў канцы 1940-х – 1970-х гадах пры А.В.Аладавай музей набыў у прыватных калекцыянераў карціны Апалінарыя Гараўскага.

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь цяпер знаходзіцца семнаццаць карцін Апалінарыя Гіляравіча Гараўскага (у дужках пазначаны час стварэння той ці іншай работы). Гэта "Пейзаж з ракой і дарогай" (1853),. "Вечар" (1854),. "Сельскі пейзаж" (1855), "Жаночы партрэт (1857), "Яўрэй на малітве" (1857(?), "Купальшчыцы" (1858), ""Марыя Магдалена, якая каецца" (1861), "У кузні" (1862), "Партрэт невядомай з палітрай" (1867), "Жаночы партрэт. У раяля" (1868), "Партрэт маці" (1868), "Старэнькая пры малітве" (1872), "Вечар у Мінскай губерні" (1870-е), "Клевер у колеры" (1895). "Пейзаж" (1897), "Партрэт Л.Ф.Лагорыю" (1890-е), "Заросшы пруд" [17].

У гісторыі беларускага мастацтва, бадай, няма больш такога выпадку, калі таленавітымі мастакамі станавіліся тры браты. Я маю на ўвазе братоў Гараўскіх – ураджэнцаў маёнтка Уборкі цяперашняга Бярэзінскага раёна.

Апалінарый быў сярэднім з братоў. Яго старэйшы брат Іпаліт нарадзіўся 1 ліпеня 1828 года. Першапачатковыя звесткі па выяўленчаму мастацтву ён атрымаў ад Машчынскага – выкладчыка Мінскай гімназіі, у якой вучыўся з 1840 па 1847 год. Потым працяглы час Іпаліт Гілярavіч удасканальваў свае веды самастойна, пісаў і маляваў з натуры. Нязначныя сродкі, якія мелі бацькі І.Г.Гараўскага, не дазвалялі адначасова вучыць у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў абодвух братоў. Пагэтаму сваю вучобу ў Акадэміі Іпаліт пачаў значна пазней, 1855-м годзе, пасля таг. Як яе закончыў Апалінарый. Аб поспехах Іпаліта Гараўскага ў вучобе сведчаць срэбраныя медалі першай і другой вартасці, якія ён атрымаў за пейзажы з натуры, напісаныя ім у Мінскай губерні. У 1864 годзе Іпаліт Гілярavіч атрымаў званне класнага мастака.

Вядомы яго пейзажы "На берагах ракі Бярэзіны"(1857), якая знаходзіцца ў Дзяржаўным Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу", "Від у ваколіцах Бабруйска"(1858).

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь захоўваецца карціна Іпаліта Гілярavіча "У крыжа. Смерць паўстанца".

Далейшы лёс жывапісца пакуль застаецца невысветленым. Вядома толькі, што ў сярэдзіне 1860-х гадоў Іпаліт Гараўскі быў хатнім настаўнікам дзяцей генерала Дружыніна ў Мінску, затым пражываў у Кіеве (у 1860-1870-я гады.. Пасля ён некаторы час жыў у Пецярбургу. З 1855 года І.Г.Гараўскі быў удзельнікам выстаў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

Доўгі час Іпаліт Гілярavіч разам з Апалінарыем дапамагаў П.М.Траццякову ў яго збіральніцкай дзейнасці. Многія карціны гэтага мастака, аб якіх маюцца ўпамінанні ў пісьмах да П.М.Траццякова, да сённяшняга часу не выяўлены. Але па карціне "На берагах ракі Бярэзіны"" і па водгукам сучаснікаў можна судзіць аб незвычайным таленце І.Г.Гараўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Малодшы брат Апалінарыя - Гілярый Гі ляравіч быў таленавітым акварэлістам другой паловы XIX стагоддзя. Да 1868 года ён вучыўся ў рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастацтваў ў Пецярбургу, а потым – да 1873 года ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Сярод творчай спадчыны найбольшую цікавасць уяўляюць "Від шпіля Петрапаўлаўскага сабора" (1870), "Кветкі "(1872). На вялікі жаль, нам да сённяшняга дня нам дакладна невядомы гады жыцця Г.Г.Гараўскага.

Тым чытачам, хто хоча пазнаёміцца са знешнім выглядам Апалінарыя Гараўскага, можна параіць паглядзецьз яго карціну "Аўтапартрэт".

Жыццё і дзейнасць выдатнага мастака, вядомага пейзажыста і партрэціста А.Г.Гараўскага дастойны таго, каб яго іменем былі названы вуліцы ў гарадах Мінску, Бабруйску, Беразіно, вёсцы Брадзец Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.

Літаратура

1 Письма художников к П.М.Третьякову. М., 1960. С.25..

2..На самой справе лёс пейзажа невядомы. У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь захоўваецца пейзаж "Балота", падпісаны А.Гараўскім, аднак стылістычныя асаблівасці гэтай работы не даюць падстаў сцвярджаць, што яна належыць кісці А.Гараўскага.

3. "Отечественные записки", 1853. № 3. С.42.

4. Пазней А.Гараўскі жаніўся на адной з дачок Бенуа.

5. Письма художников к П.М.Третьякову. С.11.

6. Тамсама. С.20.

7. Орлова М.А. Искусство Советской Белоруссии. М., 1960. С.23.

8. Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. Минск, 1974. С.173-174.

9. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Ленінграда (далей – ЦДГАЛ). Фонд акадэміі мастацтваў. Воп.14. Спр.789. Арк.9..

10. Дробаў Л. "Колькі праўды ў фарбах..."//Мастацтва Беларусі. 1983. № 10. С.44.

11 ЦДГАЛ. Фонд акадэміі мастацтваў. Воп.14. Спр. 789. Арк.47..

12. ЦДГАЛ. Ф.789. Воп.14. Спр.42. Арк.26.

13. "Новости» от 30 марта 1888.

14. Архіў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі, 1/1150/ пісьмы А.Гараўскага да П.М.Траццякова.

15."Петербургская газета», 1890.№ 61.

16.Лазука Б. Гісторыя беларускага мастацтва. У двух тамах. Т.II. Мінск, 2007. С.167.

17.Русская дореволюционная и советская жииопись. В собрании Национального художественного музея Республики Беларусь. В 2 т. Т.1. Минск, 1995. С.232-239.

Эмануіл Рыгоравіч **І**офе, прафесар БДПУ імя М.Танка,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

доктар гістарычных навук
220005, г.Мінск, пр.Незалежнасці,39-90. Т.2-84-83-79.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ